*Гриценок Анна Евгеньевна, 14 лет*

Праўду дзед кажа: так і было:
Рабілі свой крок у бяссмерце,
Каб супыніць велізарнае зло,
Каб жылі дарослыя, дзеці.

Я кніжку чытала – зямлі ўспамін –
Пра подзвіг народа вячысты,
Калі за краіну ўставаў кожны сын
Адпомсціць ліхому фашысту.

З хронік і фільмаў ведаем толькі,
З песень далёкіх… І сэрца баліць –
Колькі на долю вам выпала, колькі
Выпрабаванняў!.. Іх вам не забыць!

Я разумею вас, часта мне мроіцца
Бой ваш апошні з крывавай бядой,
Бой, што ніколі, напэўна, не скончыцца,
Бой на зямлі нашай вечнай, святой –

Той, што крывавымі зрэзана шрамамі,
Той, што заўсёды ўставала з руін,
Той, што стагоддзі палала пажарамі…
Сёння ж радзіме пяем светлы гімн!

Бусел цябе ахінае хай крыламі,
Мір і пяшчоту нясе ў сіняве.
І хай ніколі, зямля мая мілая,
Вораг-чужак не здратуе цябе.

Верую ў гэта… Пад валатоўкамі
Дзеці твае з гэтай вераю спяць…
І ў знак пашаны, любові і гонару
Будзем шчаслівы іх сон вартаваць.